Іван Штэйнер

Доктар філала. навук прафесар,
Гомельскага дзяржаўнага
ўніверсітэта імя Ф. Скарыны

# СЛОВА ПРА БІБЛІЯТЭКУ

Супрацоўніцтва з галоўнай бібліятэкай Гомельшчыны я пачаў на мяжы 1977–1978 гг., калі паступіў у аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, якую тады ўзначальваў мой будучы навуковы кіраўнік прафесар Мікола Грынчык. Ён і падабраў мне тэму будучай дысертацыі па тэорыі і гісторыі жанра балады, за што я заўсёды ўдзячны Міколе Міхайлавічу. Паколькі патрэбна было прасачыць зараджэнне і эвалюцыю таямнічага і загадкавага жанра ў еўрапейскай традыцыі, то прыйшлося ісці да самай багатай бібліятэкі ў палескім рэгіёне. Мяне сустрэлі вельмі прыветна, я адразу пасябраваў з апантанымі, у добрым сэнсе слова, людзьмі, якія ўвялі мяне ў media res. Нельга сказаць, што быў навічком у гэтай справе. Насупраць філалагічнага корпусу БДУ імя У.І. Леніна, што знаходзіцца ў Мінску на вул. Чырвонаармейскай, стаяла Дзяржаўная бібліятэка краіны, у якую я хадзіў часцей, чым на заняткі ў Alma Mater. Там чытаў усё, што патрэбна было па праграме, і не толькі, бо спадзяваўся на ўласны густ і лёс. Але ў Гомельскай абласной бібліятэцы склаліся больш сяброўскія адносіны з краязнаўчым аддзелам і аддзелам літаратуры па замежных мовах.

З даўніх часоў у бібліятэцы збіраліся кнігі на еўрапейскіх мовах, што вельмі спрыяла напісанню работ па кампаратывістыцы. Актыўна для гэтых мэт выкарыстоўвалі і МБА. Гэта традыцыя застаецца актуальнай і да нашых дзён. Усе 15 аспірантаў, якія абаранілі дысертацыі пад маім кіраўніцтвам, таксама плённа працавалі ў абласной бібліятэцы. Цяжка пералічыць студэнтаў, якія пісалі курсавыя і дыпломныя работы з дапамогай добразычлівых і адукаваных супрацоўнікаў. Некаторыя з іх працавалі па сумяшчальніцтве на кафедры беларускай літаратуры, кіравалі студэнцкімі даследаваннямі. Пра высокі ўзровень навуковай дзейнасці ў Гомельскай абласной бібліятэцы сведчыць і той факт, што сумесна з ГДУ імя Ф. Скарыны менавіта тут праведзены Міжнародныя навуковыя чытанні «Рэгіянальнае, нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах», прысвечаныя памяці народнага пісьменніка, акадэміка І.Я. Навуменкі, а таксама канферэнцыя па праблеме ўвасаблення вобраза Ф. Скарыны ў беларускай драматургіі.

Трэба адзначыць выключна плённую і шматгранную дзейнасць бібліятэкі па прапагандзе спадчыны народных пісьменнікаў Беларусі, якіх на Гомельшчыне нарадзілася болей, чым у іншых рэгіёнах краіны. Нідзе, бадай што, не ўшаноўваюць памяць сваіх славутых землякоў так, як у нашай абласной бібліятэцы. Дзякуючы апантанай дзейнасці супрацоўнікаў краязнаўчага аддзела і кіраўніцтва бібліятэкі, пра кожнага з народных пісьменнікаў сабраны ўнікальны аўтэнтычны матэрыял.

За гады сваёй навуковай дзейнасці я наведаў шматлікія бібліятэкі ў Расіі, Польшчы, Славеніі. Але заўсёды з радасцю прыхожу ў Гомельскую абласную бібліятэку, мудры свет якой ніколі не згасне.

Таццяна Сапега

Загадчык сектара
Нацыянальнай
бібліятэкі Беларусі

# XIV МІЖНАРОДНЫЯ КНІГАЗНАЎЧЫЯ ЧЫТАННІ

26–27 красавіка 2018 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыліся XIV Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні, прымеркаваныя да 400-годдзя выдання першага «Буквара».

Арганізатарамі канферэнцыі з'яўляліся Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ). Суарганізатарамі выступілі Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка і Нацыянальны інстытут адукацыі. Партнёрамі навуковага мерапрыемства сталі праект Еўрапейскага саюза MOST і Польскі інстытут у Мінску.

Штогадовыя Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні традыцыйна збіраюць даследчыкаў кнігі з розных краін свету. Мэтай мерапрыемства з'яўляецца кансалідацыя навуковай супольнасці для абмеркавання актуальных пытанняў па вывучэнні і папулярызацыі кніжнай спадчыны, стымуляванні міжнароднага супрацоўніцтва паміж даследчыкамі кніжнай культуры. Сёлета ў канферэнцыі ўзялі ўдзел вучоныя з Беларусі, Азербайджана, Вялікабрытаніі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны. Кнігазнаўчыя чытанні аб'яднaлі кнігазнаўцаў, педагогаў, гісторыкаў, філолагаў, культуролагаў і філосафаў, якія прадставілі вынікі самых новых даследаванняў па гісторыі рукапіснай і друкаванай кніжнай спадчыны.

Першыя кнігазнаўчыя чытанні былі арганізаваны ў 1998 г. Прыемна, што праз 20 гадоў некаторыя арганізатары і ўдзельнікі першых чытанняў прынялі ўдзел у сёлетняй канферэнцыі, сярод іх Т. Рошчына, Г. Кірэева, Л. Сільнова, Л. Кірухіна, Г. Галенчанка, Л. Доўнар, В. Герасімаў, Т. Самайлюк, А. Сцефановіч, А. Цітавец, С. Лявонцьева, З. Ярашэвіч-Перасляўцава і інш.

На працягу двух дзён адбыліся пленарнае пасяджэнне, шэсць секцый, майстар-клас «Вучым грамату лёгка» і адкрыццё выстаўкі «Буквары народаў свету». На пленарным пасяджэнні з навуковымі дакладамі і прэзентацыямі выступілі знакамітыя даследчыкі: А. Суша, намеснік дырэктара НББ, кандыдат культуралогіі («Юбілей адной кнігі – юбілей усёй культуры: да 400-годдзя першага "Буквара"»); Ю. Шустава,

5р69h






дацэнт кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і археаграфіі Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта, старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела рэдкіх кніг Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт («Кириллические Буквари XVI–XVIII вв., изданные на белорусских землях, в собрании Российской государственной библиотеки»); А. Мірановіч, прафесар Беластоцкага ўніверсітэта, доктар хабілітаваны («Падручнікі для школ брацкіх на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст.»); Г. Мажэйка, дактарант Абердзінскага ўніверсітэта («Мартирологии и поминальные книжки: влияние английских и шотландских иезуитов на печатную культуру Великого Княжества Литовского в конце XVI – начале XVII в.»); В. Бачкоўская, дырэктар Музея кнігі і кнігадрукавання Украіны («Українські книжкові скарби: презентація колекції Музею книги і друкарства України»); Ю. Цыбульс, аўтар буквароў, калекцыянер з Латвіі, «Народы мира, их языки и буквари».

Паспяхова адбыліся наступныя секцыі: «Буквар і асветніцкія традыцыі Беларусі», «Навучанне грамаце і беларуская букварыстыка», «Рукапісная і друкаваная кніга XVI–XVIII стст. у айчынных і замежных зборах», «Беларуская кніга XIX–XX стст.», «Гістарычныя бібліятэкі і развіццё бібліятэчнай справы Беларусі», «Мастацкае афармленне рукапіснай і друкаванай кнігі».

У межах канферэнцыі адбылося адкрыццё міжнароднай выставы «Буквары народаў свету». Упершыню ў Беларусі дэманстравалася каля 1 400 буквароў на 587 мовах свету. Аснову экспазіцыі склаў унікальны збор латвійскага педагога і калекцыянера Ю. Цыбульса. Асаблівае месца на выставе занялі беларускія кнігі для навучання грамаце XVI–XXI стст. з фондаў НББ. Розныя па мове, складзе, мастацкім афармленні, педагагічных прыёмах навучання, яны прадэманстравалі 400-гадовую гісторыю беларускага буквара.

Кнігазнаўчыя чытанні сталі адным з найбольш важных мерапрыемстваў, якое аб'ядноўвае даследчыкаў і спецыялістаў розных краін. Сёлетняя канферэнцыя стала годным працягам існуючай традыцыі. На падвядзенні вынікаў работы ўдзельнікі канферэнцыі выказалі падзяку за высокі ўзровень арганізацыі мерапрыемства.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала і выдала зборнік матэрыялаў XIV Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў. Структура зборніка адлюстроўвае разнастайнасць тэм, якія абмяркоўваліся на канферэнцыі. Даклады, якія прагучалі падчас чытанняў, выкананы на высокім навуковым узроўні, вызначаліся актуальнасцю, навізной падыходаў да вырашэння пастаўленых навуковых праблем. Разгледжаныя ў дакладах пытанні маюць вялікае навуковае і прыкладное значэнне. У рабоце канферэнцыі бралі ўдзел як вядомыя вучоныя, так і маладыя даследчыкі.

**Summary**

The work of 14th International book readings.



«Бібліятэчны свет», 2018, № 3 (102). Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1223. Падпісана да друку 18.06.2018. Фармат 60x84 1/8.
Гарнітура «Helios». Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 3,72. Тыраж 900 экз. Заказ 819. Кошт свабодны.
Выдавец і паліграфічнае выкананне: дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».
ЛП № 02330/182 ад 30.07.2009.
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
© «Бібліятэчны свет», 2018

Нацыянальная бібліятэка Беларусі